Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад рэктара ГрДУ імя Янкі Купалы
14.04.2021 № 427

ПАЛАЖЭННЕ
аб дэпазітарным фондзе сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Палажэнне аб дэпазітарным фондзе сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў рэгулюе дзейнасць навуковай бібліятэкі ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» (далей – ГрДУ імя Янкі Купалы), якая абслугоўвае дэпазітарны фонд сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў, прынятых на дэпаніраванне ў ГрДУ імя Янкі Купалы.

2. Навуковая бібліятэка ГрДУ імя Янкі Купалы пры абслугоўванні дэпазітарыяў кіруецца Палажэннем аб дэпаніраванні ў электроннай форме дакументаў і дадзеным Палажэннем, Статутам універсітэта, іншымі прававымі актамі.

## ГЛАВА 2
## ПРЫЗНАЧЭННЕ ДЭПАЗІТАРЫЯЎ

3. Дэпазітарны фонд сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў прызначаны для таго, каб садзейнічаць устойліваму развіццю інфармацыйна-рэсурснай базы адукацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь.

4. З дапамогай дэпазітарнага фонду сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў дасягаюцца наступныя мэты:

4.1. улік і рэгістрацыя сігнальных экзэмпляраў электронных дакументаў, прынятых для дэпаніравання ў ГрДУ імя Янкі Купалы;

4.2. забеспячэнне захоўвання сігнальных экзэмпляраў электронных дакументаў, прынятых для дэпаніравання ў ГрДУ імя Янкі Купалы;

4.3. інфармаванне грамадскасці аб выніках навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі, якія садзейнічаюць павышэнню яго якасці.

5. Для рэалізацыі пералічаных мэтаў работнікі, якія абслугоўваюць дэпазітарны фонд сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў, выконваюць наступныя задачы:

5.1. прыём на захоўванне сігнальных экзэмпляраў электронных дакументаў, прынятых для дэпаніравання ў ГрДУ імя Янкі Купалы;

5.2. прысваенне кожнай адзінцы захоўвання нумара дэпаніравання;

5.3. улік і рэгістрацыя электронных дакументаў, прынятых для дэпаніравання ў ГрДУ імя Янкі Купалы;

5.4. тэхналагічнае, тэхнічнае і метадычнае забеспячэнне захоўвання электронных дакументаў

5.5. размяшчэнне электроннай копіі дэпаніраванага дакумента на сайце навуковай бібліятэкі ў раздзеле «Дэпаніраванне», у электронным каталозе навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы;

5.6. інфармаванне карыстальнікаў аб наяўнасці дэпаніраваных электронных дакументаў праз часопіс «Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы», электронны каталог навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы, сайт навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы.

6. Прынцыпы дзейнасці па фарміраванні і выкарыстанні дэпазітарнага фонду сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў:

6.1. забеспячэнне аўтарскіх правоў і інтэлектуальнай уласнасці;

6.2. выкарыстанне сучасных тэхналогій і праграмнага забеспячэння, якое забяспечвае надзейнае захоўванне інфармацыі на ўзроўні сусветных патрабаванняў і якое выключае несанкцыянаваны доступ да дадзеных.

## ГЛАВА 3
## УЛІК І ЗАХОЎВАННЕ ЭЛЕКТРОННЫХ ДАКУМЕНТАЎ

7. Улік электронных дакументаў, прынятых для дэпаніравання ў ГрДУ імя Янкі Купалы, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з тэхналогіяй, прынятай у навуковай бібліятэцы ГрДУ імя Янкі Купалы.

8. Дэпазітарны фонд сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў з'яўляецца закрытым фондам навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы (які лакалізаваны ў асобным сховішчы з вызначаным рэжымам захоўвання і доступу).

9. Аб'ектамі захоўвання дэпазітарыяў з'яўляюцца дакументы на электронных носьбітах працяглага захоўвання.

10. Прынятыя на захоўванне электронныя дакументы падлягаюць стандартнай машыначытальнай каталагізацыі.

## ГЛАВА 4
## АБСЛУГОЎВАННЕ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ ДЭПАЗІТАРЫЯ

11. Абслугоўванне сігнальнымі асобнікамі дакументаў з дэпазітарнага фонду сігнальных экзэмпляраў дэпаніраваных дакументаў арганізуецца ў выпадку пісьмовага звароту аўтара/арганізацыі з дазволу дырэктара навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы ў рэжыме чытальнай залы.

12. Абслугоўванне электроннымі копіямі дэпаніраваных дакументаў, размешчаных на сайце навуковай бібліятэкі ў раздзеле «Дэпаніраванне», у электронным каталозе навуковай бібліятэкі ГрДУ імя Янкі Купалы, вядзецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб Электроннай бібліятэцы ГрДУ імя Янкі Купалы.